# ФЕНОМЕН ГІСТАРЫЧНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ ЯК ФОРМА МУЗЕЙНАЙ МЕДЫЯЦЫІ

**Д. М. Дзем'яновіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*denis.dem02@mail.ru;*
*навук. кір. – Н. М. Здасюк, ст. выкладчык*

У дадзеным артыкуле разглядаюцца прыклады ўзаемадзеяння музейных устаноў з прадстаўнікамі руху ваенна-гістарычнай рэканструкцыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Вылучаны асноўныя музейныя мерапрыемствы, накіраваныя на скарачэнне дыстанцыі паміж музейнай экспазіцыяй і наведвальнікамі музея, у якіх удзельнічаюць рэканструктары.

***Ключавыя словы:*** музеалогія; музейная медыяцыя; гістарычная рэканструкцыя; музейнае супрацоўніцтва; фестывалі рэканструктараў.

З развіццём музеялогіі і музейнай сеткі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, неабходна больш наглядна даносіць гісторыю да наведвальнікаў, каб людзі лепей разумелі гістарычны кантэкст экспанатаў, прадстаўленых у музейнай экспазіцыі. Для гэтага патрабуецца «медыятар» – чалавек, які можа стаць праваднікам паміж музейным прадметам і наведвальнікам. Ён пагрузіць наведвальніка ў гістарычны кантэкст, каб рэчы ў экспазіцыі пачалі набываць сэнс і да чалавека прыходзіла разуменне практычнага прымянення музейных прадметаў у мінулым. Для гэтага выкарыстоўваюцца розныя формы музейнай медыяцыі, адной з якіх з'яўляецца феномен гістарычнай рэканструкцыі.

Прыкладам узаемадзеяння рэканструктараў і музейных супрацоўнікаў з мэтай наглядна данесці гісторыю да грамадскасці з'яўляюцца часовыя выставы, на якіх прадстаўлены даспехі, зброя і іншыя рэчы, якія выкарыстоўваюцца рэканструктарамі ў іх дзейнасці.

У 2020 годзе з 10 жніўня па 11 кастрычніка у Нацыянальным гістарычным музее Рэспублікі Беларусь праходзіла выстава «Гістарычная рэканструкцыя. Дакраніся да мінулага» [7]. Усе даспехі, прадстаўленыя на выставе, былі выраблены паводле гістарычных узораў з захаваннем тэхналогіі і функцыянала. Акрамя даспехаў на выставе прысутнічалі макеты ўзбраення XIV–XVII ст.ст. Экспанаты, прадстаўленыя на выставе, былі створаны і прадстаўлены рэканструктарам Юрыем Усціновічам і кавалём Дзмітрыем Андрэевым.

Гэтыя ж людзі прадстаўлялі экспанаты і для выставы «Ferrum Bellum. Ваенна-гістарычная рэканструкцыя», якая праходзіла ў Мінскай гарадской ратушы з 15 мая 2021 года па 30 студзеня 2022 года [6]. На

выставе былі прадстаўлены: даспехі рыцараў, мячы, кінжалы, шчыты, баявыя сякеры і іншыя прадметы.

Тэматыка некаторых музейных праектаў напрамую звязана з удзельнікамі-рэканструктарамі. Яны могуць выступаць у ролі жывых манекенаў, убраныя ў поўны камплект рыштунку рэканструюемай эпохі або ў амаль акцёрскім амплуа – у вобразах салдат мінулага. Добра экіпіраваныя рэканструктары выступаюць у якасці медыятараў – нада-юць падзеі комплекснасць, дапамагаюць зразумець кантэкст у жывым выглядзе.

Так, рэканструктары Беларусі прымаюць актыўны ўдзел у акцыі «Ноч музеяў» [3].

Напрыклад, 18 мая 2019 года Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны прадставіў наведвальнікам праграму «10 адценняў музейнай ночы» [1]. У працэсе праходжання квэста па экспазіцыі музея ўдзельнікам неабходна было адгадаць адценне (сэнса-вы акцэнт) кожнага з 10 залаў. Розныя актыўнасці і персанажы ў залах дапамагалі наладзіцца і адчуць атмасферу. Рэканструктары-партызаны распавядалі і паказвалі на практыцы, як ва ўмовах суровага побыту яны афарбоўвалі ніткі і шылі сцягі, «радысты» вучылі наведвальнікаў азбуцы Морзэ, на пляцоўцы самалёта Лі-2 наведвальнікі выконвалі розныя заданні ад «каменданта» аэрадрома.

У Жабінкаўскім раённым гісторыка-краязнаўчым музеі ў правядзенні мерапрыемства прымалі ўдзел удзельнікі клуба ваенна-гістарычнай рэканструкцыі «Железный Желудь», якія прадэманстравалі рэканструк-цыю бітвы 9–11 стст. [3].

У Жлобінскім гісторыка-краязнаўчым музее рэканструктарамі і музейнымі супрацоўнікамі былі праведзены: ваенна-гістарычны квэст «Партызанскімі сцежкамі», віктарына «Дарогамі вайны», віктарына «Разведчыкі» і інш. Таксама ваенна-гістарычны клуб «Газдава» з г. Бабруйска паказаў рэканструкцыю рыцарскіх баёў [3].

На пляцоўцы перад Кобрынскім ваенна-гістарычным музеем ім. А. В. Суворава наведвальнікаў сустракалі ўдзельнікі клуба рэканструкцыі «Перунова кола», якія распавядалі пра даспехі старажыт-ных славян і вікінгаў, іх побыт у сярэднявеччы [3].

15 мая 2021 года ў гісторыка-культурным комплексе «Лінія Сталіна» прайшла традыцыйная «Ноч музеяў». Удзельнікі мерапрыемства паказалі рэканструкцыю бою Афганскай вайны [2].

Таксама існуе група музеяў, на базе якіх дзейнічаюць клубы гістарычнай рэканструкцыі і перыядычна ўдзельнічаюць у музейных ме-рапрыемствах. У гэтых музеях рэканструктары не з'яўляюцца супрацоўнікамі і не пражываюць на тэрыторыі экспазіцыі пастаянна.

Штогод у апошнюю нядзелю мая ў мемарыяльным комплексе партызанскай славы «Хаваншчына» праходзіць інтэрактыўнае дзеянне з рэканструкцыяй ваенных падзей «Адзін дзень з жыцця партызанскага атрада» для гасцей комплексу [5]. Дзеянне разгортваецца на ўсіх аб'ектах комплексу: у штабе распрацоўваецца план баявой аперацыі, у рэдакцыі вярстаецца чарговы нумар газеты «Зоря», у камсамоле актыўна вядзецца падрыхтоўка да канферэнцыі, у санчастцы лечаць параненых партызан.

Гісторыка-культурны комплекс «Лінія Сталіна» ўяўляе сабой ваенна-гістарычны музей пад адкрытым небам. У музеі ўзноўлены і абсталяваны ротны ўчастак ўмацаванага раёна. Таксама на тэрыторыі музея базіруецца клуб гістарычнай рэканструкцыі «Солдаты Победы» [2].

Штогод на «Лініі Сталіна» праводзяцца тэматычныя мерапрыемствы з удзелам рэканструктараў, прысвечаныя Дню Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, Дню пагранічніка, Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, Дню дэсантнікаў і сіл спецыяльных аперацый, Дню ракетных войскаў і артылерыі, Дню Абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, Дню памяці воінаў–інтэрнацыяналістаў і інш [2].

Некаторыя музеі і гістарычныя месцы выкарыстоўваюць групы рэканструктараў з высокімі стандартамі гістарычнасці на спецыяльных мерапрыемствах каб данесці гісторыю да грамадскасці.

Яскравым прыкладам такога ўзаемадзеяння з'яўляюцца фестывалі гістарычнай рэканструкцыі. На тэрыторыі Беларусі маштабных фестываляў гістарычнай рэканструкцыі на тэрыторыі музейных устаноў праводзіцца не так шмат, але шэраг музееў бачыць дадзены фармат перспектыўным.

Міжнародны фестываль сярэднявечнай культуры і музыкі «Наш Грунвальд» праходзіць штогод, у апошнія выхадныя ліпеня, на тэрыторыі музея старажытных рамёстваў і тэхналогій «Дудуткі» [8].

Цэнтральнае мерапрыемства фестывалю – рэканструкцыя бітвы, якая адбылася 15 ліпеня 1410 года каля мястэчка Грунвальд, паміж войскамі Тэўтонскага Ордэна і саюзнікаў: Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага.

Штогод у рамках фестывалю праходзяць рыцарскія турніры, турніры лучнікаў, масавыя бітвы, відовішчныя конныя турніры па правілах XIV стагоддзя, на некалькіх пляцоўках праходзяць канцэрты з удзелам фолк і рок калектываў, праводзяцца майстар-класы, працуе «горад майстроў».

Фестываль гістарычнай рэканструкцыі «Эпоха Рыцарства» праходзіць штогод на тэрыторыі Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту ў вёсцы Азярцо [9]. У звычайную праграму фесты-

валя ўваходзяць: рыцарскія турніры, масавыя бітвы пешых рыцараў, турнір лучнікаў, канцэрт фольк-музыкі, сярэднявечныя танцы, рамесніцкі кірмаш, конкурсы для дзяцей і г.д.

На тэрыторыі мемарыяльнага комплекса «Брэсцкая крэпасць-герой» штогод праводзіцца фестываль ваенна-гістарычнай рэканструкцыі «22 июня. Брестская крепость» [4].

Рэканструкцыя на Кобрынскім умацаванні пачынаецца адразу пасля мітынгу-рэквіема, а 5-й гадзіне раніцы. Сярод ключавых момантаў рэканструкцыі абароны – пачатак вайны, артналёт, нямецкая танкавая атака, контратака байцоў на чале з Самвелам Мацевасянам, прарыў маёра Пятра Гаўрылава, зачыстка крэпасці і інш.

Такім чынам, рэканструктары Беларусі актыўна ўзаемадзейнічаюць з мясцовымі музеямі, дапамагаючы наглядна даносіць гісторыю да наведвальнікаў музеяў і розных мерапрыемстваў, арганізаваных музеямі.

Такое ўзаемадзеянне дапамагае як рэканструктарам, так і музеям. Рэканструктары сустракаюцца разам, займаюцца рэалізацыяй сваіх ведаў на практыцы, удасканаленнем сваіх навыкаў і выпрабаваннем рыштунку. Музеі атрымоўваюць наведвальнікаў, зацікаўленых той ці іншай эпохай, якія могуць убачыць якасную інтэрпрэтацыю гістарычных падзей, паўдзельнічаць у інтэрактывах, пабачыць копіі і рэплікі музейных прадметаў у дзеянні.

**Бібліяграфічныя спасылкі:**


1. Официальный сайт Белорусского государственного музея истории Великой Отечественной войны [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.warmuseum.by/. – Дата доступа: 05.04.2022.
2. Официальный сайт историко-культурного комплекса «Линия Сталина» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://stalin-line.by. – Дата доступа: 26.01.2022.
3. Официальный сайт международной акции «Ночь музеев» в Беларуси [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://nochmuzeev.by/. – Дата доступа: 18.02.2022.
4. Официальный сайт Мемориального комплекса «Брестская крепость-герой» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://brest-fortress.by/. – Дата доступа: 21.02.2022.
5. Официальный сайт Мемориального комплекса партизанской славы «Хованщина» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://hovanschina.museum.by/. – Дата доступа: 17.02.2022.
6. Официальный сайт музея истории города Минска [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://minskmuseum.by/. – Дата доступа: 01.04.2022.
7. Официальный сайт Национального исторического музея Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.histmuseum.by/. – Дата доступа: 01.04.2022.

8. Фестиваль исторической реконструкции «Наш Грунвальд» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://nashgrunwald.by/festival-blog.html. – Дата доступа: 30.09.2021.
9. Фестиваль исторической реконструкции «Эпоха Рыцарства» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://histfest.by/epoha-ryitsarstva. – Дата доступа: 30.09.2021.